УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны
лінгвістычны ўніверсітэт»
_______________ А.П. Бяценя

«29» ___чэрвеня___ 2023 г.

Рэгістрацый № УД-492/04/08-Т /вуч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасцей:

6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)»
6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)»
6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)»
6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)»

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» для ўстаноў вышэйшай адукацыі (зацверджана намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.04.2022 г. Рэгістрацыйны нумар № ТД-СГ.037/тып.) і вучэбных планаў па спецыяльнасцях установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)», 6-05-0113-08 ««Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)».

**УКЛАДАЛЬНІКІ:**
С. Я. Новікаў, загадчык кафедры гісторыі і сацыяльных навук установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт
А. Г. Цымбал, дацэнт кафедры гісторыі і сацыяльных навук установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі і сацыяльных навук установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»,
(пратакол № 11 ад 26 чэрвеня 2023 года);

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»,
(пратакол № 10 ад 29.06.2023 года)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Месца вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца тым, што прадметам яе вывучэння з'яўляюцца найбольш важныя пытанні дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа. Вывучэнне дадзенай вучэбнай дысцыпліны арыентавана на фарміраванне ўстойлівых уяўленняў аб гістарычным мінулым і напрамках далейшага развіцця беларускай дзяржавы.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» з'яўляецца складовай часткай сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі перакладчыкаў, лінгвістаў, спецыялістаў па міжкультурнай камунікацыі, выкладчыкаў.

Характэрнымі рысамі вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» з'яўляюцца яе міждысцыплінарнасць і акцэнт на канцэптуальныя веды па гісторыі развіцця дзяржаўных інстытутаў, над'емныя атрыбуты гісторыі беларускай дзяржаўнасці, фарміраванне практыка-арыентаваных уменняў. Вучэбная дысцыпліна адлюстроўвае сістэмны падыход да гісторыі фарміравання і развіцця розных этапаў беларускай дзяржаўнасці, іх эвалюцыю з улікам унутраных фактараў і глабальных працэсаў.

Тэматыка лекцыйных і практычных заняткаў нясе ў сабе значны ідэйна-палітычных патэнцыял, застаючыся пры гэтым у межах акадэмічнай традыцыі.

Лекцыі раскрываюць асноўныя праблемы па кожнай тэме. Семінарскія заняткі праводзяцца па тэмах, якія патрабуюць замацавання тэарэтычных ведаў, атрыманых на лекцыях і ў выніку самастойнай работы над вучэбным матэрыялам.

У сістэме сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбнымі планамі спецыяльнасцей 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)», 6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)» вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» з'яўляецца дысцыплінай дзяржаўнага кампаненту.

Мэтай вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў абгрунтаванай патрыятычнай пазіцыі.

Зыходзячы з мэты выцякаюць наступныя задачы вучэбнай дысцыпліны:

– фарміраванне сістэмы ведаў аб гісторыя беларускай дзяржаўнасці і развіццё ўменняў асэнсоўваць падзеі і з'явы сучаснасці ў цеснай узаемасувязі мінулага, сучаснага і будучага;

– стварэнне ўстойлівага ўяўлення аб гістарычным шляху і мэтах далейшага развіцця беларускай дзяржавы;

– развіццё навыкаў аргументавана і дакладна фармуляваць сваю пазіцыю па актуальных пытаннях палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сфер.

Веданне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» неабходна для вывучэння наступных вучэбных дысцыплін: «Культуралогія» і «Сучасная палітэканомія».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» студэнт павінен:

***ведаць*:**

- метадалагічныя асновы і перыядызацыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці;
- ключавыя катэгорыі, звязаныя з гісторыяй і дзяржаўным будаўніцтвам Рэспублікі Беларусь;
- характарыстыкі канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;
- этапы фарміравання беларускай нацыі;
- гісторыка-рэтраспектыўныя і сучасныя характарыстыкі культурна-цывілізацыйнага развіцця Беларусі;

***умець:***

- фармуляваць і аргументаваць асноўныя ідэі і каштоўнасці беларускай мадэлі развіцця;
- выкарыстоўваць атрыманыя веды ў практычнай вучэбнай і прафесійнай сферах;
- характарызаваць атрыбутыўныя рысы беларускай нацыі;
- аналізаваць асноўныя факты і падзеі ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці, даваць ім аб’ектыўную ацэнку;

***валодаць:***

- базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;
- сістэмным і параўнальным аналізам;
- даследчыцкімі навыкамі;
- міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

Агульныя патрабаванні да фарміравання універсальных кампетэнцый выпускніка вызначаюцца наступнымі прынцыпамі:

*гуманізацыі* як прыярытэтнага прынцыпу адукацыі, які забяспечвае асобасна-арыентаваны характар адукацыйнага працэсу і творчую самарэалізацыю выпускніка;

*фундаментальнасці,* якая садзейнічае арыентацыі зместу дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу на выяўленне істотных асноў і сувязей паміж рознымі працэсамі навакольнага свету, прыродазнаўчымі і гуманітарнымі ведамі;

*кампетэнтнаснага падыходу*, фарміруючага сістэму патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэсу, накіраваных на павышэнне ролі самастойнай работы студэнтаў, мадэлюючага сацыяльна-прафесійныя

праблемы і шляхі іх вырашэння, што забяспечвае фарміраванне ў выпускнікоў умення дзейнічаць у зменлівых жыццёвых абставінах;

*сацыяльна-асобаснай падрыхтоўкі,* заснаванай на адзінстве духоўнасці, грамадзянскасці і сацыяльнай актыўнасці асобы якая ўсведамляе сваю неразрыўнасць з мінулым, сучасным і будучым Беларусі і дзейнічае ў інтарэсах яе развіцця і абароны;

*міждысцыплінарнасці і інтэгратыўнасці* сацыяльна-гуманітарнай адукацыі, рэалізацыя якога забяспечвае цэльнасць вывучэння гуманітарных ведаў і яго ўзаемасувязь з сацыяльным кантэкстам будучай прафесійнай дзейнасці выпускніка.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» забяспечвае фарміраванне наступных *універсальных кампетэнцый:*

-умець аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, вызначаць сацыяльна-эканамічнае значэнне гістарычных падзей, асоб, артэфактаў і сімвалаў для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, у дасканаласці выкарыстоўваць выяўлены заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці.

-валодаць якасцямі патрыятызму і грамадзянскасці:

-быць здольным фарміраваць сваю ўласную кропку погляду на вывучаемы працэс (з’яву);

-валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем;

-валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

Змест вучэбнай дысцыпліны, формы кантролю і тэхналогіі навучання накіраваны не толькі на набыццё студэнтамі тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў, неабходных для засваення спецыяльнасці, але і на развіццё каштоўна-асобаснага, духоўнага патэнцыялу навучэнцаў, фарміраванне ў іх грамаўска-патрыятычных якасцей, гатоўнасці да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці беларускай дзяржавы.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі спецыяльнасцей 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)» агульная колькасць гадзін, адведзеных на праходжанне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», складае 108 акадэмічных гадзін, у тым ліку 54 аўдыторных, з якіх: 36 лекцыйных гадзін і 18 гадзін семінарскіх заняткаў, самастойная работа студэнтаў плануецца ў аб’ёме 54 акадэмічных гадзін. Па спецыяльнасці 6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)» агульная колькасць гадзін складае 108 акадэмічных гадзін: усяго аўдыторных – 16 гадзін, у тым ліку: 10 – лекцыйных, 6 семінарскіх, самастойная работа – 92 гадзіны.

Па вучэбнай дысцыпліне прадугледжана напісанне выніковага рэферата.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на працягу аднаго семестра (I) на 1 курсе навучання студэнтаў.

У якасці формы прамежкавай атэстацыі па выніках вывучэння вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца экзамен. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – *вочная* (*дзённая) па спецыяльнасцях* 6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-02 «Перакладчыцкая справа (з пазначэннем моў)», 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (з пазначэннем моў)», *завочная па спецыяльнасці* 6-05-0113-08 «Лінгвістычная адукацыя (з пазначэннем мовы)».